

ДЗЕ РАБІЦЬ ЗАПАСЫ НА ЗІМУ?

4

УБАЧЫЦЬ ПАРЫЖ І... АДЖЫЦЬ

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

16 ВЕРАСНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 182 (29804)

## КОРАТКА

• Адзіны бясплатны дзень для наведвання музеяў навучэнцамі школ і каледжаў устанавілі ў Беларусі. Такім днём вызначана апошняя серада месяца. Наведаць музеі можна будзе па папярэднім запісе.

• У Беларусі з 17 верасня стартуе месячнік па азеляненні. Падчас яго правядзення плануецца высадзіць больш за 143 тысячы дрэў.

• У Аршанскай гарбальніцы адкрылі аддзяленне МРТ.

• Мастакі з сямі краін адлюструюць прыгажосць Магілёўскай вобласці на пленэры па жывапісе.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КРЭЧ, намеснік міністра лясной гаспадаркі:**

*«У 2021 годзе адзначалася значнае павышэнне цэн на лесаматэрыялы і пілапрадукцыю. Гэты перыяд паказаў сур'ёзныя недахопы існуючых правіл па водпуску драўніны насельніцтву. Калі юрыдычнымі асобамі завышаюцца цэны на прадукцыю і кошт разлічваецца па сярэднебіржавых каціроўках, гэта няправільна, так быць не павінна. Таму было прынята рашэнне змяніць гэтыя правілы. Сёння правілы рэалізацыі драўніны напісаны перш за ўсё для насельніцтва і ў рамках указа нават падобныя на адміністрацыйную працэдуру. У развіццё гэтага ўказа будзе прынята пастанова Міністэрства лясной гаспадаркі, якая зараз знаходзіцца на канчатковай стадыі ўзгаднення».*

З першых вуснаў

# «ЧАС НАМ СТАЦЬ ПАЎНАПРАЎНЫМ ЧЛЕНАМ НАШАЙ «ШАНХАЙСКАЙ СЯМ'І»




Фота БелТА.

**Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка з рабочым візітам прыляцеў у Самарканд, дзе гэтымі днямі праходзіць саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. У графіку беларускага лідара — выступленне на пасяджэнні ў пашыраным складзе Савета кіраўнікоў дзяржаў — членаў ШАС. А ў першы дзень саміту адбыліся рабочыя сустрэчы з замежнымі калегамі, галоўнай тэмай якіх стала двухбаковае ўзаемадзеянне.**

### ШАС зацікаўлена ў нашай краіне

Работа Аляксандра Лукашэнкі на палях саміта ШАС пачалася з сустрэчы з гаспадаром мерапрыемства — Прэзідэнтам Узбекістана Шаўкатам Мірзіёевым. Сустрэча амаль цалкам прайшла ў закрытым для прэсы фармаце.

Аляксандр Лукашэнка таксама правёў сустрэчу і з Генеральным сакратаром ШАС Чжан Мінам. Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь супрацоўнічае з арганізацыяй ужо 12 гадоў.

СТАР. 2

Удзячная памяць

# «Я З БРЭСТА. САМВЕЛ МАЦЕВАСЯН»

## У Брэсцкай крэпасці шануюць подзвіг абаронцаў 30 нацыянальнасцяў і народнасцяў

**Амаль ва ўсім свеце ведаюць пра подзвіг абаронцаў Брэсцкай крэпасці, якія першымі ў нашай краіне сустрэлі фашысцкую навалу 22 чэрвеня 1941 года. Шмат іх тады палягло пад бомбамі і снарадамі, а таксама ў няроўных баях з праціўнікам. Бо адважныя салдаты і афіцэры гарнізона нават у пякельнай цэмры суцэльнай бамбардзіроўкі і абстрэлаў сумелі арганізаваць абарону і даць зразумець ворагу, што не варта разлічваць на хуткую перамогу.**

### Пад плітамі некропаля

Колькі іх засталося навечна ў зямлі Брэсцкай крэпасці, ніхто дакладна не ведае. У ходзе пошукавых работ знойдзены астанкі 1038 загінулых пры абароне ў чэрвені — ліпені 1941 года, імёны 277 увекавечаны на плітах некропаля, астатнія пахаваны як невядомыя. Паводле слоў **загадчыцы навукова-экспазіцыйнага аддзела мемарыяльнага комплексу Святланы ДРАНЕВІЧ,** устаноўлена, што крэпасць абаранялі воіны трыццаці нацыянальнасцяў і народнасцяў. Сярод іх былі беларусы, рускія, украінцы, татары, яўрэі, калмыкі, грузіны, узбекі, казахі, асеціны. Пад плітамі некропаля знайшлі спачын людзі 21 нацыянальнасці. Подзвіг абсалютнай большасці з іх адкрыў свету рускі пісьменнік Сяргей Смірноў.

А музей абароны крэпасці, які пачаў працаваць у 1956 годзе, пазней мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» заўсёды былі на варце памяці ўсіх герояў крэпасці, незалежна ад іх нацыянальнасці. Тут шанавалі загінулых і прывячалі абаронцаў з усяго Савецкага Саюза, якім пашчасціла застацца ў жывых. Многія з іх прайшлі праз палон, што значна ўскладніла іх далейшае жыццё, наклала адбітак на біяграфію, кар'еру. Але ў Брэсцкай крэпасці іх заўсёды чакалі, з імі перапісваліся, падтрымлівалі, на месцы былых баёў у любы час сустракалі як герояў.




Фота Святланы ЯСКЕВІЧ.

Пліта некропаля.

СТАР. 3

Харчовая бяспека

# НАМ ХОПІЦЬ БУЛЬБЫ І НА ЎЛАСНЫЯ ДРАНІКІ, І НА ЭКСПАРТ

**У гэтым годзе, дзякуючы гарачаму жніўню, уборку бульбы і гародніны з адкрытага грунту пачалі прыкладна на два тыдні пазней, чым звычайна. Ужо цяпер спецыялісты Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання разлічваюць атрымаць бульбы на 6 % больш, чым летась. А ўраджай гародніны павялічыцца не менш чым на 3 %. Пра гэта заявіла намеснік начальніка ўпраўлення па вытворчасці бульбы і плодаагародніннай прадукцыі Мінсельгасхарча Таццяна ГУМЯНЮК.**

### Паспеў добры ўраджай

На палях сельскагаспадарчых прадпрыемстваў плануюць сабраць 934 тысячы тон бульбы і 560 тысяч тон гародніны. На сёння момант беларускімі аграрыямі ўбрана толькі 17 % плошчаў, на якіх растуць плады і гародніна. Сёння бульбы нарыхтавалі 149 тысяч тон пры сярэдняй ураджайнасці 337 цэнтнераў з гектара, што на 57 цэнтнераў больш, чым летась.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ЧАС НАМ СТАЦЬ ПАЎНАПРАЎНЫМ ЧЛЕНАМ НАШАЙ «ШАНХАЙСКАЙ СЯМ'І»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па яго словах, беларускі крок па ўступленні ў «шанхайскую сям'ю» ў якасці назіральніка не быў спантанным ці выпадковым. «Тады Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва была яшчэ маладой, спрабавала ўбудавацца ў сусветны парадак. Гэта ўжо зараз на ШАС глядзяць як на будучыню, вельмі ўплывовы полюс нашай планеты. Тады было не так. Але мы ў той час вызначыліся, што будзем развіваць наша супрацоўніцтва з Шанхайскай арганізацыяй. У гэтым наша і палітычная, і эканамічная, можа, і ваенна-палітычная будучыня. Таму, працуючы ў якасці назіральніка ў арганізацыі, мы прынялі рашэнне, што час нам стаць паўнапраўным членам «шанхайскай сям'і». Ведаю, вы нас падтрымалі і падтрымліваеце на гэтым шляху. І мы вам за гэта вельмі ўдзячны», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Чжан Міну за пазітыўную ацэнку дзейнасці Беларусі ў якасці назіральніка і за тое, што ў арганізацыі заўсёды адгукаліся на просьбы беларускага боку. «У апошнія прэзідэнцкія выбары вы бралі ўдзел. Вы маглі ўбачыць Беларусь, ацаніць яе, вашы прадстаўнікі (назіральнікі на выбарах). І я вам удзячны за тыя ацэнкі, якія былі дадзены падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў. Гэта сведчыць аб тым, што і ШАС зацікаўлена ў нашай краіне», — адзначыў беларускі лідар.

У сваю чаргу Чжан Мін падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за ўдзел у саміце, адзначыўшы, што ён з'яўляецца пастаянным госцем на такіх форумах. Генеральны сакратар таксама падкрэсліў важнасць і значнасць для Беларусі сёлетняга саміту ў Самаркандзе.

## «Вы можаце на нас разлічваць»

Двухбаковую сустрэчу Аляксандр Лукашэнка правёў і з прэм'ер-міністрам Пакістана Шахбазам Шарыфам. «Мы прывезлі вам найлепшыя пажаданні ад народа Пакістана. І наша дэлегацыя, і наш урад ведаюць, што вы вельмі даўні сябар нашай краіны», — прывітаў беларускага лідара Шахбаз Шарыф. Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся, што Беларусь і Пакістан з'яўляюцца добрымі сябрамі. «Больш за тое, між б у вас ні былі адносіны з вашым родным братам (Навазам Шарыфам, які неаднаразова займаў пасаду прэм'ер-міністра Пакістана. — **Заўв.**), вы павінны ведаць, што гэта мой добры сябар. Сустракаючыся з папярэднімі кіраўнікамі Пакістана, я ўвесь час, нягледзячы на іх перакананні, адносіны з Навазам, пытаўся пра яго здароўе, самаадчуванні, дзе ён знаходзіцца. І вы ведаеце, яны мне заўсёды адкрыта расказвалі пра вашага брата. А пра вас першы раз я пачуў менавіта ад яго, таму я не мог вас не павіншаваць, мы пераживалі за тое, каб вы сталі прэм'ер-міністрам. Таму што шмат было зроблена ў адносінах паміж Пакістанам і Беларуссю пры Навазе Шарыфе», — заявіў Прэзідэнт. Ён запрасіў прэм'ер-міністра Пакістана наведаць Беларусь. А той у сваю чаргу запрасіў і Аляксандра Лукашэнку як мага хутчэй наведаць Пакістан.

Шахбаз Шарыф таксама заявіў аб поўнай падтрымцы імкнення Беларусі далучыцца да Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва ў якасці паўнапраўнага члена. «Мы поўнасцю падтрымліваем уступленне Беларусі ў ШАС. Мы акажам поўную падтрымку. Гэта сапраўды вялікая падзея. Вы можаце на нас разлічваць», — заявіў ён.

## «Вы заўсёды для нас былі не проста моцным сябрам»

У Самаркандзе беларускі лідар правёў перагаворы са Старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Цікавая дэталь — на сустрэчы Аляксандр Лукашэнка быў у ахоўнай масцы са сцягам Кітая. Як паведаміў тэлеграм-канал «Пул першага», некалькі дзясяткаў такіх масак ён папрасіў з сабой у Мінск. Як вядома, у Кітаі прытрымліваюцца строгіх супрацьэпідэмічных абмежаванняў.

«Дарагі старшыня, дзякую вам за тыя добрыя словы, якія вы толькі што сказалі. Калі хочаце ведаць наша стаўленне да Кітайскай Народнай Рэспублікі і вас асабіста ў сённяшні момант, памножце тое, што вы сказалі, на два. Вы заўсёды для нас былі не проста моцным, надзейным сябрам, але і сур'ёзнай апорай у гэты няпросты час. Які час, вы не горш за мяне ведаеце», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў нацэленасць Беларусі на паглыбленне адносін з Кітаем. «Мы заўсёды падтрымлівалі Кітай ва ўсіх прынцыповых пытаннях, такіх як эканамічны рост, адзінства, цэласнасць Кітая, палітыка «аднаго Кітая». Па ўсіх пытаннях мы заўсёды былі побач, і нават калі нехта хацеў бы нас у нечым папракнуць, не знойшоў бы такой нагоды. Так будзе заўсёды. Мы надзейныя сябры. Чаго б нам ні каштавала, калі мы паабяцалі, гэтай палітыкі і практыкі будзем прытрымлівацца», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён падзякаваў кітайскаму калегу за тое, што ў няпросты час — пандэмію і нестабільнасць у свеце — бакі знайшлі ў сабе сілы і рашучасць для таго, каб вывесці адносіны на новы ўзровень жалезнага брацтва, узорнага ўсебаковага стратэгічнага супрацоўніцтва і ўсёпагодняга партнёрства. «На вельмі прыстойны і годны ўзровень. І мы зробім усё для таго, каб вы не пашкадавалі аб гэтым і не памыліліся ў сваім выбары», — запэўніў беларускі лідар.

Асобна Прэзідэнт падзякаваў за падтрымку ў пытанні набыцця Беларуссю статусу паўнапраўнага члена Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. Ён расказаў, што, сустракаючыся з кіраўнікамі краін — членаў ШАС, гаварыў аб тым, што ні ў адной краіны не будзе прэтэнзій да Беларусі наконт выканання прынцыпаў супрацоўніцтва ў рамках арганізацыі. «Ну а такі немалы і надзейны сябар у Еўропе, як Беларусь, заўсёды будзе карысны не толькі для Шанхайскай арганізацыі, але і для КНР», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама падзякаваў кіраўніку МЗС КНР, усяму знешнепалітычнаму ведамству Кітая, Міністэрству камерцыі гэтай краіны за рашучасць і хуткасць дзеянняў, з якімі бакі рэалізоўваюць дамоўленасці. «Той «Вялікі камень», які мы з вамі заклалі ў Беларусі, расце, пашыраецца, нягледзячы на перашкоды асобных дзяржаў. Мы поўныя рашучасці і далей працягваць гэта развіццё», — заявіў беларускі лідар. Асобна Аляксандр Лукашэнка падзякаваў за падтрымку развіцця біятэхналагічнай галіны. Па яго словах, бакі дамовіліся ў найбліжэйшы час сустрэцца ў Мінску і абмеркаваць пашырэнне супрацоўніцтва не толькі ў сферы біятэхналогій, але і матэматыкі, фізікі, оптаэлектронікі.

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

Адукацыя

# БАЧЫЦЬ АБІТУРЫЕНТА

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА правяла нараду па пытаннях удасканалення ўступнай кампаніі ва ўстановы вышэйшай адукацыі, паведамляе БелТА.**

Да абмеркавання былі запрошаны педагогі гарадскіх і сельскіх школ з розных рэгіёнаў краіны, сенатары, а таксама **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.**

У прыватнасці, тэмай сустрэчы з экспертамі стала ўступная кампанія 2023 года. 23 жніўня на нарадзе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў да канца года канчаткова вызначыцца з правіламі яе правядзення. «Прэзідэнт уважліва адносіцца да пытанняў адукацыі, — сказала Наталля Качанава. — Кіраўнік дзяржавы гаворыць правамерна: мы часам добрых юнакоў і дзяўчат не бачым за тэстамі. Тэсты добрыя тым, што выключаюць карупцыйны складнік. Таму адыходзіць зусім ад тэстаў няправільна. Тэсты павінны застацца. Але як нам убачыць дзіця пры паступленні ў ВНУ?»

Тэма маючай адбыцца ўступнай кампаніі выклікала грамадскі рэзананс у бацькоў і педагогаў. «Былі дыялогавыя пляцоўкі, індывідуальныя сустрэчы з педагогамі, дырэктарамі школ, іх намеснікамі — усе выказвалі сваё меркаванне, — расказала **сенатар Марына ІЛЬІНА.** — Шмат абмеркаванняў ідзе наконт характарыстык. Калі будзе нейкая ўніверсальная форма характарыстыкі, якую кожная ўстанова адукацыі дакладна запоўніць і будзе разумець сваю адказнасць, — тады гэта характарыстыка зможа спрацаваць на дзяржаўную карысць. Мы ўбачым актыўных дзяцей, якія прымаюць удзел ва ўсіх мерапрыемствах. На мой погляд, гэта таксама можа быць адным з састаўных кампанентаў усёй прыёмнай кампаніі».

Характарыстыка-рэкамендацыя ад настаўнікаў для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы патрэбна, упэўнена Наталля Качанава. «І крытэрыі павінны быць, бо дзіця характарызуе не толькі вучоба. Але калі ты даў характарыстыку, то нясеш за гэта адказнасць», — падкрэсліла спікер.

«Мы цяпер сапраўды глыбока прапрацоўваем гэту тэму. Яна мае сур'ёзны грамадскі рэзананс, — дапоўніў **сенатар Алег ДЗЯЧЭНКА.** — Нашы рэспандэнты гавораць аб тым, што трэба пераходзіць да трох цэнтралізаваных экзаменаў. Замена выпускнога экзамену і ЦТ адзіным экзаменам дазволіць пазбегнуць выпускнікам стрэсаў».

Старшыня Савета Рэспублікі дадала, што трэба прааналізаваць сельскія школы, каб ва ўсіх дзяцей былі аднолькавыя ўмовы для паступлення ў ВНУ. Наталля Качанава дала даручэнні прааналізаваць, ці мелі месца ў мінулым годзе выпадкі, калі моцнае дзіця не паступіла ў ВНУ і чаму гэта адбылося.

Акрамя таго, спікер упэўнена: у педагагічную прафесію павінны прыходзіць людзі па патрабаванні сэрца. «У школах і дзіцячым садку павінны працаваць людзі, якія любяць дзяцей», — падкрэсліла яна.

Толькі педагог-патрыёт можа выхаваць у дзяцей любоў да Радзімы. «Вы выхоўваеце дзяцей, і дзіця ўсё бачыць», — удакладніла Наталля Качанава.

Савет Рэспублікі прадоўжыць прапрацоўку гэтага пытання і накіруе свае прапановы ў Міністэрства адукацыі.

# ДЫКТОЎКА, ЧЭЛЕНДЖ, МОДНЫ ПАКАЗ

**Тыдзень роднай мовы «Якая ты дарагая мне, мая родная мова!» пройдзе з 19 да 23 верасня, паведамілі ў Міністэрстве адукацыі.**

Тыдзень роднай мовы прадугледжвае мноства самых разнастайных мерапрыемстваў — ад выстаў, анлайн-чэленджу «Льецца мова» і творчага марафону «Мова родная — мова модная» да паказу адзення «Будзь у трэндзе» і анлайн-акцыі «Натхнёныя Бацькаўшчынай», дзе можна будзе пазнаёміцца з відэасюжэтамі аб знакамітых беларусах, падрыхтаванымі навучэнцамі ўстаноў адукацыі. Уласна кажучы, прысвечаныя тыдню роднай мовы мерапрыемствы стартуюць ужо загадзя: сёння адбудзецца рэспубліканская дыктоўка, прымеркаваная да Дня народнага адзінства. З тэкстам дыктоўкі можна пазнаёміцца на нацыянальным партале https:// adu.by/ru, а яго трансляцыя пачнецца ў 13.30.

— Да дзяржаўнага свята — Дня народнага адзінства — Міністэрства адукацыі праводзіць агульную дыктоўку для ўсіх устаноў адукацыі: пачынаючы ад агульнай сярэдняй адукацыі і заканчваючы ўстановамі ВНУ, — адначасова абвешчаную дыктоўку «Дзень народнага адзінства», — адзначыў **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.** — Тэкст гэтай дыктоўкі размешчаны на нашай платформе adu.by Нацыянальнага інстытута адукацыі. На базе лінгвістычнага ўніверсітэта яго будзе пісаць наш маладзёжны парламент, будзе пісаць міністр адукацыі.

Трансляцыя пройдзе ў якасці стрыму на анлайн-платформе YouTube. Падключэнне магчыма па спасылцы https://www.youtube.com/c/ON_First_Channel.

— Усе, хто захоча, змогуць далучыцца. Адпаведны ліст быў накіраваны ў нашы абласныя падраздзяленні. Хочацца адзначыць, што аб гэтым ведаюць вышэйшыя навучальныя ўстановы, сярэднія спецыяльныя. Гэта не дыктоўка, якая павінна правярыць веды па арфаграфіі або пунктуацыі, — падкрэсліў намеснік міністра. — Дыктоўка накіравана на тое, каб навучэнцы нашых навучальных устаноў, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, усе тыя, хто пажадаў бы, змаглі прайсціся па тых радках і ўспомніць падзеі 17 верасня 1939 года і тое, што гэта дата значыць для беларусаў.

Тыдзень роднай мовы абяцае быць цікавым і насычаным.

— Намі складзены план мерапрыемстваў па кожным дні гэтага тыдня, — расказаў Аляксандр Кадлубай. — План уключае шэраг разнастайных мерапрыемстваў: маладзёжныя акцыі, сустрэчы са знакамітымі пісьменнікамі, дыктоўкі, чытанне вершаў, квэсты, гульні, квізы. На маё меркаванне, такія мерапрыемствы вельмі добра ўпішуцца ў маладзёжнае асяроддзе і ў першую чаргу павялічаць цікавасць моладзі да роднай мовы, да яе ўжывання. І пашыраць асяроддзе тых, хто выкарыстоўвае ў сваім жыцці родную мову.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 17 верасня, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Іванавіч КОЗЕЛ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь Іосіфавіч НЯВЕРА. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Генадзь Іванавіч ДЗЕНГАЛЁЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# «Я З БРЭСТА. САМВЕЛ МАЦЕВАСЯН»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Думаю, далёка не ўсе ведаюць, што легендарны лейтэнант Андрэй Кіжаватаў быў па нацыянальнасці мардвін. На пачатак вайны ён камандаваў 9-й заставай 17-га пагранічнага атрада, якая дыслацыравалася на тэрыторыі крэпасці. Спачатку камандзір разам з байцамі абаранялі заставу, а калі застава была разбіта, паранены, ён далучыўся да іншых вайскоўцаў і кіраваў абаронай казарм 333-га палка і Цярэспальскіх варот. Загінуў у баі, пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Цяпер імя Кіжаватава носіць адна з застаў Брэсцкага пагранічнага атрада. У Брэсце яго імем названа вуліца і ў скверы абаронцаў граніцы ўстаноўлены помнік герою. Дарэчы, вуліца Кіжаватава ёсць і ў нашай сталіцы. А ў вядомым фільме «Брэсцкая крэпасць» ролю камандзіра заставы Андрэя Кіжаватава сыграў Андрэй Мярзлікін, тым самым у пэўным сэнсе таксама ўвекавечыў памяць героя ў кінематаграфіі.

Ёсць у названым фільме яшчэ адзін герой — палкавы камісар Фамін. Яфім Майсеевіч быў адным з кіраўнікоў абароны крэпасці. Параненага, са жменькай байцоў яго захапілі ў палон. Здраднік выдаў ворагу і яго статус, і нацыянальнасць. Яфіма Фаміна не павезлі ў лагер з іншымі, а расстралялі каля сцяны Холмскіх варот. Тут зараз прымацавана мемарыяльная дошка са сведчаннем подзвігу камісара. Каля таблічкі заўсёды ляжаць кветкі. Заўважыла гэта аднойчы зімой, калі не было ніякіх памятных дат, не праходзіла вялікіх мерапрыемстваў. Значыць, ёсць людзі, якім дарагая памяць пра камісара, якога, паводле сведчанняў байцоў, салдаты называлі бацькам. Імя Фаміна носіць вуліца ў Брэсце.

## Старшы сяржант Шэварднадзэ

У крэпасці тады служыла нямала выхадцаў з розных саюзных рэспублік. Адзін з іх — Акакій Шэварднадзэ, сын сельскага настаўніка, быў прызваны з сяла Мамаці Ланчхуцкага раёна Грузіі ў 1939 годзе.



Старшы сяржант Шэварднадзэ.

Служыў даволі паспяхова, у сакавіку 1941 года па выніках вайсковых вучэнняў быў адзначаны загадам камандзіра палка. А ў 1940 годзе ў лісце бацькам і братам ён не без гонару пісаў, што валодае ваеннай тэхнікай, што гатовы абараняць Радзіму і даць адпор падпальшчыкам вайны. Апошні ліст, які атрымалі родныя, датаваны 1 чэрвеня.

Матэрыялы пра старшага сяржанта Шэварднадзэ захоўваюцца ў сёмай зале музея абароны. Ён загінуў у першы дзень вайны. Яго брат доўга не ведаў, дзе магіла роднага чалавека, дзе знайшлі спачын астанкі. Брат абаронца крэпасці старшага сяржанта Шэварднадзэ стане ў свой час міністрам замежных спраў СССР. Знайсці магілу Акакія яму дапаможа кіраўнік беларускай кампартыі Пётр Машэраў. А праз 49 гадоў пасля гібелі брата Эдуард Шэварднадзэ прывязе ў крэпасць калегу — Ганса-Дзітрыха Геншэра, віцэ-канцлера ФРГ, які, дарэчы, у самым канцы вайны служыў у вермахце і абараняў Берлін. Тады гэтую сустрэчу называлі глыбока сімвалічнай. Згадваючы пра ўрокі вайны, цяжкасці на перагаворах у фармаце «два плюс чатыры», гібель брата, Шэварднадзэ гаварыў: «Англічане з французамі страшыліся ўмацавання Германіі, ды і ў СССР да ідэі ўз'яднання ставіліся неадназначна, большасць людзей напачатку выказваліся супраць. Яно і вядома: дваццаць сем мільёнаў загінула на вайне, такое не забываецца. Боль пра Вялікую Айчынную жыла ў кожным доме... Наша сям'я — не выключэнне. У 1941-м мне споўнілася трынаццаць, а старэйшаму з маіх братоў Акакію — дваццаць чатыры, ён служыў пагранічнікам у Брэсце і паў у першым баі. Яго магілу я знайшоў з дапамогай Пятра Міронавіча Машэрава, першага сакратара ЦК кампартыі Беларусі, былога партызана. На абеліску сярод імён абаронцаў крэпасці-героя высечана і прозвішча Шэварднадзэ... У чэрвені 1990-га мы з Гансам-Дзітрыхам Геншарам, тады віцэ-канцлерам ФРГ, прыляцелі ў Брэст, разам паклалі кветкі да магілы Акакія. Гэта быў жэст прымірэння, дэманстрацыя таго, што нельга жыць мінулым, трэба глядзець у будучыню».

Даўно ўжо няма ў жывых знакамітага брата абаронцы крэпасці, але яго памяць беражліва захоўваюць музеі мемарыяльнага комплексу. Пра старшага сяржанта з грузінскага сяла заўсёды расказваюць наведвальнікам экскурсаводы. На памятныя даты нязменна кладуцца кветкі да пліты мемарыяла, дзе ўвекавечана імя героя з Грузіі, што аддаў жыццё за Радзіму. (Кветкі, дарэчы, ляжалі ранкам 14 верасня, хоць напярэдадні не было ніякіх мерапрыемстваў. — **Аўт.**)

## Надпіс на сцяне рэйхстага

Варта сказаць пра яшчэ аднаго легендарнага абаронцу крэпасці — армяніна Самвела Мацевасяна. Да вайны Самвел з адзнакай скончыў Маскоўскі інстытут каляровых металаў і золата. Працаваў спачатку ў Казахстане, затым у роднай Арменіі. Па камсамольскім закліку пайшоў у армію ў 1939 годзе. Накіраванне атрымаў у 84-ы стралковы полк 6-й стралковай дывізіі ў Брэсце. Да пачатку вайны старшына Мацевасян быў намеснікам палітрука і камандзірам аддзялення ў Брэсцкай крэпасці. 22 чэрвеня Самвел Мацевасян стаў адным з кіраўнікоў абароны крэпасці. Ён камандаваў першай контратакай, у ходзе якой аддзяленне знішчыла атрад нямецкіх аўтаматчыкаў, што прарваліся бліжэй да цэнтра крэпасці. На трэці дзень вайны Мацевасян атрымаў раненне асколкам снарада, яго перанеслі ў падвал разам з астатнімі раненымі, дзе ён і быў захоплены ў палон 5 ліпеня 1941 года.

Самвелу Мінасавічу выпала шмат выпрабаванняў не толькі ў ваенным жыцці, але і ў мірны час, і ніколі гэтыя нягоды не зламалі адважнага воіна, абаронцу... А тады, у 1941-м, з іншымі ваеннапалоннымі яго прывезлі ў лагер пад самым Брэстам. Калі восенню рана зажыла, Самвел уцёк з лагера і далучыўся да атрада партызан. У адным з баёў атрымаў цяжкае раненне і вымушаны быў застацца ў сялянскай сям'і да выздараўлення. Але праз некаторы час яго заўважылі мясцовыя паліцаі, ледзьве паспеў уцячы, трапіў на Валыншчыну, у Луцк. Уладкаваўся на працу ў арцель па рамонце абутку, выйшаў на сувязь з падпольшчыкамі. Пасля вызвалення Луцка быў прызваны ў армію і накіраваны на афіцэрскія курсы, пасля іх заканчэння ў званні лейтэнанта прыняў пад камандаванне штурмавую роту. Удзельнічаў у штурме Берліна. За час баявых дзеянняў яшчэ тры разы паранены. У Берліне распісаўся на рэйхстагу, напісаў: «Я з Брэста. Самвел Мацевасян».

Пасля дэмабілізацыі доўга не мог уладкавацца па спецыяльнасці з-за свайго знаходжання ў палоне і на акупаванай тэрыторыі. Але праявіў упартасць, настойлівасць і ўсё ж трапіў у геолагаразведвальную экспедыцыю, дзе заняўся любімай справай. Мацевасян быў адным з першых, каму пісьменнік Сяргей Смірноў дапамог вярнуць добрае імя. Дзякуючы хадайніцтву Смірнова, Мацевасян у 1955 годзе быў адноўлены ў партыі з захаваннем партыйнага стажу. А пазней быў прадстаўлены да звання Героя Савецкага Саюза, ды прадстаўленне было адхілена зноў жа з-за палону і знаходжання ў Беларусі і Украіне падчас акупацыі.

У 1971 годзе Мацевасян быў удастоены звання Герой Сацыялістычнай Працы. І тады з-за недарэчнай памылкі ў адным з тамоў Вялікай Савецкай Энцыклапедыі жыццё абаронцы крэпасці пайшло наперакасяк. У выданні ён быў названы ў ліку загінулых пры абароне Брэсцкай крэпасці. У ЦК КПСС прыйшла ананімка аб тым, што сапраўдны Мацевасян загінуў, а іншы прысвоіў сабе дакументы і біяграфію. І хоць факты не знайшлі пацвярджэння, з'явіліся іншыя зачэпкі, каб героя вайны выключыць з партыі і пазбавіць зоркі Героя Працы. І толькі ў 1987 годзе справа супраць Мацевасяна была спынена за адсутнасцю саставу злачынства. А ў 1996 годзе званне Героя Сацыялістычнай Працы вярнулі зноў. Памёр гераічны абаронца крэпасці ў 2003 годзе ва ўзросце 90 гадоў. У згаданым мною вышэй кінафільме «Брэсцкая крэпасць» яго ролю выканаў артыст Бёнік Аракелян.

А ў Брэсце подзвіг Мацевасяна шанавалі ўвесь час. І ў музеі абароны, і ў экспазіцыі «Музей вайны — тэрыторыя міру» ёсць раздзелы пра Самвела Мацевасяна. І кожны год, 22 чэрвеня, падчас гістарычнай рэканструкцыі першага дня вайны ўзнаўляецца адзін з галоўных эпізодаў абароны крэпасці пад назвай «Контратака аддзялення Самвела Мацевасяна». Тую смелую атаку ўдзельнікі ваенна-гістарычных клубаў вывучаюць асобна, ужываюцца ў вобразы. Праходзіць яна віДовішчна, напружана, захапляльна. Пра гэты знакавы эпізод абароны ведаюць удзельнікі Паста памяці Брэсцкай крэпасці. Пра яе нязменна згадваюць на працягу кожнай змены маладзёжнага ваенна-патрыятычнага цэнтра. У Брэсце жыве памяць пра адважнага армянскага старшыну Самвела Мацевасяна.

Па словах **загадчыцы экспазіцыі Алены ГРЫЦУК**, удзячныя сваякі напярэдадні стагоддзя бацькі і дзеда перадалі мемарыяльнаму комплексу некаторыя рэчы, дакументы і муляж Зоркі Героя Працы. Цяпер гэтыя экспанаты знаходзяцца ў экспазіцыі «Музей вайны — тэрыторыя міру».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# АДКАЗАЦЬ ПАВОДЛЕ ЗАКОНА

**У канцы жніўня ў чат-бот тэлеграм-канала «Міліцыя Мінска» паступіла інфармацыя ад жыхароў сталіцы: на 19-павярховым доме па вуліцы Лесі Украінкі нехта вывесіў палотнішча бчб-расфарбоўкі і сцяг Украіны.**

Падрабязнасці здарэння расказаў начальнік Цэнтральнага РУУС Мінска Віталь Семянцоў.

Паводле яго слоў, падчас аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў супрацоўнікі міліцыі на сёння затрымалі ўжо пяць мінчан (мужчыны і жанчыны ва ўзросце ад 35 да 51 года). Усе яны былі ў экстрэмісцкіх тэлеграм-каналах, мелі зносіны паміж сабой у раённых чатах.

Як цяпер ужо вядома, так званую пратэсную акцыю арганізавала мінчанка, якая цяпер жыве за мяжой. А чаго яшчэ чакаць?! Дык вось яна праз месенджары падбадзёрвала выканаўцаў, давала ім указанні. Ёй жа адпраўляліся і фотасправаздачы аб праведзенай рабоце для далейшага размяшчэння на экстрэмісцкіх рэсурсах.

Вядома, што перад выхадам «на справу» зламыснікі старанна рыхтаваліся: размяркоўвалі ролі, праводзілі рэкагнасціроўку, вызначалі месцы здымкі, назіралі за аб'ектамі. З мэтай канспірацыі выкарыстоўвалі радыёстанцыі і закрыты (як яны думалі) канал сувязі. Аднак на самай справе ўсе іх перагаворы паміж сабой былі вядомы праваахоўнікам.

Таму не было цяжкасцяў устанавіць, што затрыманыя маюць дачыненне да эстрэмісцкай дзейнасці, а ў 2020 годзе некаторыя з іх удзельнічалі ў пратэсных акцыях.

Органамі ўнутраных спраў працягваецца поўнамаштабная мэтанакіраваная работа па прыцягненні да адказнасці ўсіх, хто мае дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці, каб прыцягнуць іх да строгай адказнасці ў адпаведнасці з адпаведным заканадаўствам краіны.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Fitch значна пагоршыла прагноз росту сусветнай эканомікі




Агенцтва Fitch Ratings пагоршыла прагноз сёлетняга росту сусветнай эканомікі з 2,9 да 2,4 працэнта. «Еўрапейскі газавы крызіс, высокая інфляцыя і рэзкае паскарэнне тэмпаў узмацнення жорсткасці грашова-крэдытнай палітыкі ў свеце прыводзяць да сур'ёзных наступстваў для перспектыў эканомікі», — адзначаецца ў абноўленым Global Economic Outlook. Прагноз росту сусветнага ВУП на 2023 год паніжаны адразу з 2,7 да 1,7 працэнта. Эканомікі еўразоны і Вялікабрытаніі апынуцца ў рэцэсіі ўжо ў бягучым годзе, а ЗША сутыкнуцца з мяккай рэцэсіяй у сярэдзіне 2023 года, прагназуе Fitch. ВУП еўразоны, паводле новага прагнозу агенцтва, налета знізіцца на 0,1 працэнта з-за наступстваў газавага крызісу (у чэрвені чакалася павышэнне на 2,1 працэнта). Прагноз росту эканомікі ЗША на 2022 год пагоршаны з 2,9 да 1,7 працэнта, налета — з 1,5 да 0,5 працэнта.

## Кіраўнік урада Швецыі пайшла ў адстаўку



Прэм'ер-міністр Швецыі Магдалена Андэрсан, якая раней прызнала паражэнне на парламенцкіх выбарах, накіравала спікеру парламента Андрэасу Норлену прашэнне аб адстаўцы. Аб гэтым паведаміў партал Nordic News. Андэрсан, якая з'яўляецца лідарам Сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі Швецыі, раней заяўляла, што ў новым урадзе яна ўзначаліць «сацыял-дэмакратаў у апазіцыі». Як вядома, парламенцкія выбары ў каралеўстве адбыліся 11 верасня. З вынікам у 49,5 працэнта лідзіруе блок правых партый, прадстаўлены ўмеранай кааліцыйнай партыяй, «Лібераламі», Хрысціянска-дэмакратычнай партыяй і «Шведскімі дэмакратамі». Чырвона-зялёны блок з кіруючых партый («Сацыял-дэмакратычная рабочая партыя Швецыі», Левая партыя, «Зялёныя», а таксама Партыя Цэнтра) набраў 48,8 працэнта галасоў. Кожны партыйны блок атрымае ў парламенце 176 і 173 месцы адпаведна.

## Падарункі прэм'еру Індыі пойдуць з малатка ў дзень яго нараджэння



Каля тысячы падарункаў і сувеніраў Нарэнры Модзі будуць выстаўлены на аўкцыёне заўтра, калі кіраўнік урада будзе адзначаць сваё 72-годдзе. Як паведаміла газета Payoneer, электронны аўкцыён стане чацвёртым у серыі такіх продажаў, якія апарат прэм'ер-міністра праводзіць з 2019-га. Ён адбудзецца пад эгідай міністэрства культуры Індыі і працягнецца да 2 кастрычніка. Нарэндра Модзі адмовіўся захоўваць падарункі, атрыманыя ў дні нараджэння і па іншых выпадках, і ўжо тройчы яны з вялікім поспехам прадаваліся на аўкцыёнах. Атрыманыя сродкі накіроўваліся на дабрачынныя мэты, паведаміла газета Payoneer. Зараз даходы ад аўкцыёну будуць накіраваны на праграму па ачыстцы свяшчэннай для індуістаў ракі Ганг. Сёлета свой дзень нараджэння Нарэндра Модзі адзначыць у штаце Мадх'я-Прадэш, дзе ў нацыянальным парку Куна выпусціць у дзікую прыроду восем гепардаў, дастаўленых з Намібіі для аднаўлення ў Індыі папуляцыі гэтых рэдкіх жывёл.

# НАМ ХОПІЦЬ БУЛЬБЫ І НА ЎЛАСНЫЯ ДРАНІКІ, І НА ЭКСПАРТ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Тацццяна Гумянюк адзначыла, што эксперты ўпэўненыя: пладоў і ягад будзе ўбрана сёлета на ўзроўні мінулага года — каля 184 тысяч тон, а яблыкаў — больш за 170 тысяч тон.

Па словах намесніка начальніка ўпраўлення па вытворчасці бульбы і плодаагароднiннай прадукцыі Мінсельгасхарча, гародніну толькі пачынаюць збіраць. У цэлым сітуацыя на палях здавальняльная: сыравіны хапае, яна якасна і своечасова ўбіраецца.

«Так, па стане на 13 верасня ў сельскагаспадарчых арганізацыях ідзе збор яблыкаў. На дадзены момант у нас сабрана 7,8 тысячы тон пладоў і ягад. Вырашчана ў абароненым і адкрытым грунце больш за 110 тысяч тон агуркоў, таматаў, баклажанаў, капусты, цыбулі і перцу. Такім чынам, аб'ём вырашчанай прадукцыі будзе дастаткова для фарміравання стабілізацыйных фондаў, а таксама для забеспячэння патрэб у перапрацоўцы і інш.», — расказала спецыяліст.

Паводле яе слоў, дадзеныя аб'ёмы прадукцыі, якія атрымалі ў сельскагаспадарчых арганізацыях, сялянскіх і фермерскіх гаспадарках, дазваляюць у поўнай меры задаволіць патрэбы ўнутранага рынку, а таксама мець экспартныя рэсурсы. У прыватнасці, па бульбе і гародніне экспартны патэнцыял складае каля 300 тысяч тон, а па пладах і ягадах — 60 тысяч тон.

## Міжсезоннае захоўванне і не толькі...

Белкаапсаюз адкрывае сезон нарыхтовак ужо ў апошнюю дэкаду мая — менавіта ў гэты час у руплівых аграрыяў паспявае першая бульба. Потым людзі актыўна прадаюць саюзу клубніцы і іншыя ягады, агуркі, памідоры, яблыкі. І заканчваюць сезон спецыялісты Белкаапсаюза купляй у насельніцтва позніх грыбоў і журавін.

Сёлета на міжсезоннае захоўванне арганізацыі спажывецкай кааперацыі плануюць нарыхтаваць больш за 10 тысяч тон плодаагароднiннай прадукцыі, з іх 4-5 тысяч тон бульбы, 5-6 тысяч тон гародніны і больш за тысячу тон свежых яблыкаў. Пра гэта паведаміла **начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.**

Па стане на 9 верасня саюз закупіў ужо пяць тысяч тон бульбы, больш за 17 тысяч тон гародніны, 14,5 тысячы тон пладоў і ягад. Урадзілі сёлета клубніцы: закуплена 660 тон, з якіх палову рэалізавалі ў свежым выглядзе насельніцтву.

Актыўна зараз збіраюць яблыкі. Нарыхтавалі ўжо больш за 18 тысяч тон. Асноўныя пакупнікі ў арганізацыі — перапрацоўчыя прадпрыемствы. Па словах начальніка ўпраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза, папулярнасцю ў спажыўцоў карыстаюцца мочаныя яблыкі.

З ягад тут закупляецца чырвоная і чорная парэчкі, а таксама чарнаплодная рабіна, вырошчванне якой паступова аднаўляецца ў нашай краіне. Таксама актыўна набываюць дурніцы і маліну. Аксана Скіндэр заўважыла, што напярэдне яшчэ збор пазнейшых грыбоў і яблыкаў. Дарэчы, з 10 верасня дазволілі сёлета збіраць журавіны. А на «паляванне» па яе ходзяць у некаторых месцах нават у снежні. Штогод гэтай ягады закупляецца каля адной тысячы тон. Журавіны запатрабаваны не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, у краінах Еўропы.

Паводле слоў спецыяліста, у параўнанні з мінулым годам закупачныя цэны на таварныя пазіцыі выраслі. Так, цяпер бульба закупляецца ад 50 да 70 капеек за кілаграм, а летні таварны яблык каштуе ад рубля да рубля і 30 капеек.

«Паколькі сезон збору ўраджаю ў гэтым годзе ссунуўся, то ў канцы жніўня — верасні людзі яшчэ здымалі з дрэў яблыкі летніх сартоў. Такія яблыкі мы рэалізоўваем у рознічнай гандлёвай сетцы. Казаць аб цэнах на пазнейшыя сарты пакуль рана, але ўсё ж іх кошт будзе вышэйшы, чым у мінулым годзе», — дадала спецыяліст.

На працягу апошніх васьмі гадоў Белкаапсаюз вядзе актыўную работу з фермерскімі гаспадаркамі па доўгатэрміновых дагаворах. Са слоў Аксаны Скіндэр, беларускія фермеры навучыліся вырабляць перцы і таматы розных колераў і сартоў. Яны вырошчваюць розныя сарты капусты, якая ў свежым выглядзе прысутнічае ў рознічнай гандлёвай сетцы і на рынках.

«Гэтая прадукцыя ў шырокім асартыменце будзе прадстаўлена і на сельскагаспадарчых кірмашах, якія пройдуць у раёнах, абласных цэнтрах і, вядома ж, у Мінску. У гэтыя выхадныя, 17—18 верасня, — першы кірмашовы гандаль у Мінску. Традыцыйна наша пляцоўка будзе прадстаўлена на «Чыжоўка-Арэне». Плануецца гандаль свежай плодаагароднiннай, перапрацаванай і дзікарослай прадукцыяй. Таксама — прадукты з мяса: пачынаючы ад паўфабрыкатаў, заканчваючы гатовымі мяснымі вырабамі па нашых асаблівых тэхналогіях», — падсумавала спецыяліст.

Усяго гэтай арганізацыяй за здадзеную прадукцыю за восем месяцаў было выплачана каля 355 мільёнаў рублёў, з іх насельніцтву — 235 мільёнаў рублёў.

## Да 100 тысяч тон — перапрацоўка

Менавіта такая колькасць плодаагароднiннай прадукцыі штогод перапрацоўваецца ў Беларусі. З гэтага аб'ёму 80 % — айчынная сыравіна. **Намеснік начальніка аддзела цукровай, кансервавай і дражджавой галін упраўлення па вытворчасці прадуктаў харчавання канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Алена АНДРЭЕВА** заявіла, што сёлета спецыялісты канцэрна пачынаюць актыўна працаваць з мясцовай аляпіхай, агрэстам, баклажанам і чарнаплоднай рабінай. Работнікі галіны імкнуцца фарміраваць свае стабільныя сыравінныя зоны ў вёсках, каб пастаянна супрацоўнічаць з сялянскімі і фермерскімі гаспадаркамі. Вядома, тут патрэбна і падтрымка мясцовых органаў улады.

Перапрацоўваюць беларускія прадпрыемствы і імпартаваную прадукцыю, якая ў нас не расце, але мае высокі попыт у спажыўцоў (манга, банан, чарнасліў). Яе працэнт, вядома, значна ніжэйшы, чым колькасць нашай сыравіны. Закранула Алена Андрэева і праблемы ў галіне. Яны датычацца ў асноўным таго, што некаторыя плады і гародніна нявыгадна пастаўляць у крамы ў перапрацаваным выглядзе, паколькі выдаткі на іх кансервацыю і ўпакоўку значна вышэйшыя за іх сабекошт. Такія кансервы будуць занадта дарагія, іх ніхто не купіць.

## Пітныя ўзвары з Ляхавічаў

**Намеснік начальніка аддзела тэхналогій кансервавання харчовых прадуктаў РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні» Дзіяна САФРОНАВА** расказала, што іх цэнтр забяспечвае навуковае суправаджэнне вытворчасці кансерваванай прадукцыі на аснове садавіны, агародніны і грыбоў. Яна адзначыла, што эксперты цэнтра распрацавалі 52 дзяржаўныя стандарты і 45 тэхнічных умоў на кансерваваную прадукцыю.

Пад кіраўніцтвам Акадэміі навук былі створаны новыя кансервы на агароднiннай аснове для дзіцячага харчавання для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту (таматавы соус «Казка», агародніння соусы «Антошка» і «Рыжык», кансерваваныя агуркі, таматы і таматы чэры).

У параўнанні з прадукцыяй агульнага прызначэння, у новых кансервах прадугледжана выкарыстанне высокагатункавай гародніны, якая адказвае патрабаванням бяспекі сыравіны для дзіцячага харчавання. У іх адсутнічаюць пякучыя спецыі, воцат, у два разы зменшана колькасць дабаўленай солі, у 1,5 зніжана кіслотнасць прадукцыі. У кансервах для дзяцей адсутнічаюць фарбавальнікі, араматызатары, падсаладжвальнікі, кансерванты, генетычна мадыфікаваная сыравіна.

Дзіяна Сафронава асобна адзначыла пітныя ўзвары, якія выпрабоўваюць на Ляхавіцкім кансервавым заводзе. Спецыялісты цэнтра прапанавалі мясцовым вытворцам узвары ў новым выглядзе з нізкім утрыманнем садавіны. І яны сапраўды атрымаліся смачныя, дзякуючы ашчаднаму працэсу стэрылізацыі.

# Сельгаскірмашы ў сталіцы стартуюць у выхадныя

## Фінальны кірмаш гэтага сезона адбудзецца 4 снежня

**Як паведамілі ў Мінсельгасхарчы, на кірмашах будзе літаральна ўсё: бульба, капуста, буракі, морква, цыбуля, яблыкі, грушы, кавуны, гарбуз, шынкі, рэдзька, баклажаны, таматы, агуркі, часнок, журавіны, грыбы, арэхі, мёд і прадукцыя пчалярства, саджанцы, пасадачны матэрыял і многае іншае.**

У іх прымуць удзел сельскагаспадарчыя арганізацыі, фермерскія гаспадаркі, гандлёвыя прадпрыемствы, таваравытворцы, рыбгасы, а таксама асноўныя аптова-рознічныя прадпрыемствы, якія забяспечваюць прадукцыяй сталіцу.

У продажы будзе прадстаўлены шырокі выбар мясных паўфабрыкатаў, каўбасных вырабаў і вэнджаніны, малочнай прадукцыі.

У рамках кірмашоў прадукцыю айчыннай вытворчасці будуць рэалізоўваць прадпрыемствы спажывецкай кааперацыі сістэмы Белкаапсаюза. Рыбаводныя гаспадаркі аб'яднання «Белвадгас» прадставяць разнастайны асартымент рыбы сажалкавай і азёрна-рачной, а таксама прадукцыю яе перапрацоўкі. Нехарчовую групу тавараў прадставіць грамадскае аб'яднанне» Беларускі саюз прадпрымальнікаў». На кірмашах можна будзе набыць рамесныя вырабы ручной работы.

Цэнтральны сельскагаспадарчы кірмаш будзе праходзіць на паркоўцы каля вялікай арэны дзяржаўнай культурна-спартыўнай установы «Чыжоўка-Арэна» па вуліцы Ташкенцкай, 19



(з 9.00 да 17.00). Тут для пакупнікоў будзе арганізавана зона фудкорту, а для маленькіх наведвальнікаў — зона забавак.

У кожным раёне будуць свае кірмашы, напрыклад, у Заводскім — вуліца Несцерава, 49 (стаянка каля ГЦ Simax);

**— Ленінскі раён** — праспект Ракасоўскага, 114;

**— Маскоўскі раён** — кірмаш на праспекце Любімава, 17 будзе праводзіцца 17 і 18 верасня, 1, 2, 15 і 16 кастрычніка, 5 і 6 лістапада. На вуліцы Ясеніна, 9 гандаль разгорнецца 24 і 25 верасня, 8, 9, 22 і 23 кастрычніка, 12 і 13 лістапада;

**— Кастрычніцкі раён** — вуліца Чкалава, 7, вуліца Асаналіева, 44, вуліца Барамзіной, 10а, у жылым раёне Сокал. Там купіць сельскагаспадарчую прадукцыю можна будзе 17 і 24 верасня, у любую з субот у кастрычніку і лістападзе, а таксама 3 снежня;

**— Савецкі раён** — парк Дружбы народаў;

**— Партызанскі раён** — бульвар Трактарабудаўнікоў 17 і 18 верасня, 8, 9, 22, 23 верасня, 5, 6, 19, 20 лістапада, 3 і 4 снежня; вуліца Філімонава, 13/1 24 і 25 верасня, 15 і 16 кастрычніка, 26 і 27 лістапада; вуліца Антонаўская, 30 — 1 і 2, 29 і 30 кастрычніка; вуліца Карвата, 4 — 15 і 16 кастрычніка, 12 і 13 лістапада; вуліца Пуліхава, 15 — 24 і 25 верасня, 29 і 30 кастрычніка, 26 і 27 лістапада; вуліца Солтыса (стаянка паміж дамамі № 46 — № 60) — 1 і 2 кастрычніка, 12 і 13 лістапада);

**— Першамайскі раён** — вуліца Русіянава. На вуліцы Гінтаўта, 12 пляцоўка будзе працаваць толькі 22, 23, 29 і 30 кастрычніка;

**— Фрунзенскі раён** — вуліца Прытыцкага, 27 (пляцоўка ля Мінскага лядовага палаца спорту) — кожныя выхадныя;

**— Цэнтральны раён** — вуліца Кахоўская, 31 — толькі па суботах.

Акрамя таго, у адміністрацыях раёнаў Мінска штодня з 15 верасня да 15 лістапада для ажыццяўлення гандлю арганізацыямі Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў, арганізацыямі — вытворцамі сельскагаспадарчай прадукцыі, сялянскімі (фермерскімі) гаспадаркамі і фізічнымі асобамі бульбай і плодаагароднiннай прадукцыяй айчыннай вытворчасці выдзелены месцы паблізу жылых мікрараёнаў, шматкватэрных жылых дамоў.

Надвор'е

# ЦЫКЛОНЫ ПРЫНЯСУЦЬ СУР'ЁЗНЫЯ ДАЖДЖЫ

## З панядзелка пахаладае

**Усе мы чакаем у верасні бабінага лета, але ў гэтыя выхадныя да нас занясе непагадзь з Балтыйскага мора і іншыя цыклоны, якія канчаткова сапсуюць надвор'е, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сіноптыкі адзначаюць, што тэмпературны фон паступова набліжаецца да тых значэнняў, якія характэрны для другой дэкады верасня. А 16 верасня максімальная тэмпература паветра складзе ад 13 да 19 градусаў цяпла. Пад уплывам атмасферных франтоў і няўстойлівых паветраных мас, якія паступаюць з Балтыйскага мора, пройдуць кароткачасовыя дажджы.

У суботу ўмовы надвор'я прадвызначае фарміраваць умерана цёплыя паветраныя масы, што паступаюць з Балтыкі. Пры гэтым істотных ападкаў па краіне не чакаецца, толькі раніцай і днём месцамі па поўначы краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будзе згушчацца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу 4—9 градусаў цяпла. Удзень паветра прагрэецца да плюс 13—19 градусаў.

У нядзелю ўначы надвор'е будзе вызначаць вобласць паніжанага атмасфернага ціску. Пры развіцці воблачнасці месцамі па поўдні краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. А вось раніцай і днём у нядзелю пра сябе заявіць цыклон з цэнтрам над Чарнігаўскай вобласцю, які сапсуе надвор'е канчаткова. Дажджы распаўсюдзяцца на большую частку тэрыторыі краіны. Удзень месцамі па паўднёвым усходзе дажджы дасягнуць крытэрыяў моцных і месцамі будуць суправаджацца моцным парывістым ветрам. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу складзе плюс 4—10 градусаў. Дзённыя максімумы апынуцца ў межах 11—17 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак яшчэ будзе захоўвацца ўплыў цыклону, які ідзе праз Смаленскую вобласць на Ленінградскую. На большай частцы тэрыторыі краіны будуць адзначацца дажджы, часам моцныя. У асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 5—12 градусаў. Удзень не перавысіць 8—14 цяпла. У далейшым на тэрыторыю Беларусі чакаецца паступленне няўстойлівых і прахалодных паветраных мас з паўночнага захаду Еўропы. Тэмпературны фон па краіне панізіцца і будзе ў асноўным на 1—3 градусы ніжэй за кліматычную норму.

У аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы чакаецца ад плюс 4 градусаў да 10 цяпла. Днём будзе плюс 9—15.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

Сядзі і глядзі

# ГЕРОІ — НА ЎСІХ ТЭЛЕЭКРАНАХ

**З 18 верасня тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі пачынаюць новы вяшчальны сезон 2022/2023, а значыць, тэлеаўдыторыю чакаюць не толькі новыя выпускі даўно ўжо любімых праграм і рубрык, але і старт прэм'ерных шоу і праектаў. А прадстаўляць серыю навінак «Героі».**

Такую назву мае адна з прэм'ер восені на тэлеканале «Беларусь 1» — маштабнае спартыўна-забаўляльнае шоу выхаднога дня. Нас чакае сучаснае прачытанне фармату культавай тэлегульні для дзяцей і падлеткаў «Вас выклікае Спартландыя!» у антуражы відэагульні, што з'яўляецца вынікам агульнай працы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба, Белтэлерадыёкампаніі, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях і Беларускай федэрацыі пажарна-выратавальнага спорту. У межах спаборніцтва сустрэнуцца 16 каманд юнакоў і дзяўчат (з ліку старшакласнікаў, навучэнцаў секцый пажарна-ратавальнага спорту) з усіх абласцей краіны.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ
**(«Звязда»)** Выпуск № 174

